*Я нарадзіўся тут*

# Вёска з шасцісотгадовай гісторыяй

***У вёсцы Моўчадзь (Баранавіцкі раён) у XVI ст. жылі беларусы, палякі, яўрэі, татары. У 2-й палове XVIII ст. гэта было вялікае мястэчка, жыхароў больш за 1000 – 1500 чалавек. Тут прайшлі маладосць і сталенне маіх бацькоў. Я жыву ў Мінску, але з дзяцінства кожнае лета прыязджала да дзядулі і бабулі, потым на вакацыі, а цяпер наведваю бацькоў, якія таксама жывуць у Моўчадзі.***



*Млын*



*Касцёл у Моўчадзі*

Кожны год у верасні вёска адзначае свята – Дзень Моўчадзі (сёлета – 17 верасня). У кнізе «Памяць. Баранавічы. Баранавіцкі раён» (2000) запісана, што з 1487 г. – гэта была ўласнасць вялікага князя Казіміра. У энцыклапедыі «Гарады і вёскі Беларусі» (т. 4. Брэсцкая вобласць; 2006) вызначана першая згадка пра Моўчадзь як мястэчка Слонімскага павета ў пісьмовых крыніцах з 1487 г., у 1-й палове XV ст. тут быў узведзены касцёл Найсвятой Тройцы.

У канцы XIX ст. Моўчадзь была вядома як вялікае паселішча, дзе праходзілі кірмашы (чатыры на год). У 1886 г. тут было 2 царквы, 3 сінагогі, чыгуначная станцыя (побач з вёскай), народнае вучылішча, а ў пачатку XX ст. Моўчадзь амаль цалкам была яўрэйскай. Не захаваўся старажытны касцёл XV ст., ад якога засталася толькі агароджа, што знаходзіцца на галоўнай плошчы побач са Свята-Петра-Паўлаўскай царквой – архітэктурным помнікам XIX ст. у псеўдарускім стылі.

У інтэрв'ю газеце «Звязда» (жнівень 2021 г.) баранавіцкі гісторык Васіль Дубейка гаворыць пра фундуш моўчадскага старасты, выдадзены касцёлу Святой Тройцы, Святых апосталаў Пятра і Паўла і Ушэсця Найсвяцейшай Панны Марыі 1 жніўня 1422 г. Гэта першая вядомая згадка вёскі ў пісьмовых крыніцах, якая дае нам права казаць пра тое, што Моўчадзь сёлета адзначае сваё 600-годдзе.

Існуюць розныя версіі паходжання яе назвы. Так, народная этымалогія выводзіць яе ад прозвішча Моўчан. Таксама ёсць іншая версія, пра якую мне распавядаў дзядуля. Калісьці на гэты край напалі ворагі. Яны рабавалі насельніцтва і зводзілі жыхароў у палон. Пад час бою ў нашых ваколіцах яны вымушаны былі адступаць, але, не ведаючы броду, патанулі ў дрыгве. А калі заціхлі іх крыкі, то пераможцы радасна гаварылі: «Маўчаць! Маўчаць!». Таксама назва мясціны магла паходзіць ад назвы ракі, якая працякае побач і мае такую ж назву.

У сярэдзіне XX ст. тут праходзіла меліярацыя, і гэтыя балоцістыя мясціны былі асушаны. Некалі вялікая паўнаводная Моўчадзь (Маўчадка, як яе ласкава называюць мясцовыя жыхары) з зарослымі дрэвамі берагамі стала ў вусці вузкай і вельмі мелкаводнай. Цяпер тут не наловіш ракаў каля берага, як рабіў мой тата, які з дзяцінства жыў у Моўчадзі і разам з бацькам хадзіў па іх. Памятаю стары фотаздымак таты і дзядулі на беразе шырокай, зарослай дрэвамі Маўчадкі. Цяпер толькі пад Наваельняй, далей ад вёскі, рака разліваецца больш шырока. У межах вёскі знаходзіцца некалькі святых крыніц, якія напаўняюць раку, ад іх вада, як гавораць вяскоўцы, стала цяпер такой халоднай.

Захавалася ў цэнтры Моўчадзі забудова яўрэйскімі крамамі, вядомымі з XVIII – пач. XX ст., яна зберагае рысы старой рынкавай плошчы і зараз. Адзін з такіх дамоў пасля вайны купіла сям'я майго таты, пасля дом быў перабудаваны, і цяпер тут жывуць мае бацькі.

У пачатку XX ст. Моўчадзь належала шляхціцам Валіцкім, якія мелі вялікі дом, сад і парк. Пасля прыходу бальшавікоў дом быў разабраны на дровы, сад знішчаны, а ад маёнтка захаваўся толькі стары млын, які ўражвае сваімі каменнымі сценамі. Часта, шпацыруючы каля яго, мне ўяўлялася, што тут стаяла нейкая невялікая фабрыка, бо па расповедах дзядулі я ведала, што ў мястэчку калісьці быў бровар. Дарэчы, і цяпер ёсць магчымасць яго набыць, каб даць другі шанец гэтаму будынку.

Такую магчымасць зажыць другім жыццём атрымала старая цагляная аптэка, якая была ўпрыгожаннем галоўнай вуліцы вёскі. Гадоў дзесяць таму ў інтэрнэт-прасторы падымалі пытанне пра захаванне яе знешняга выгляду, калі планавалася абнаўленне. Я памятаю з дзяцінства, як з бабуляй мы заходзілі ў гэтую аптэку купляць лекі. У выніку, цяпер тут размясціўся сучасны магазін Еўраопт. З аднаго боку, галоўная каштоўнасць рынкавай плошчы страціла свой старажытны выгляд, але магазін – прыкмета лепшага жыцця вяскоўцаў.

Шпацыруючы па вёсцы, заўважаеш старыя цікавыя будынкі. Так, недалёка ад рынкавай плошчы захаваўся дом, які ідэнтыфікуюць як яўрэйскую карчму. На яго франтоне ёсць выява «кубка», які ў савецкі час быў успрыняты як прыкмета таго, што тут была карчма. Але сімвалы «кідуш» (сімвал суботы) і шасціканцовая зорка Давіда хутчэй могуць гаварыць пра тое, што ў ім магла быць сінагога. У суседнім будынку знаходзіцца мясцовы клуб, які змяшчае ў сабе бібліятэку і краязнаўчы музей. Старажылы гавораць, што менавіта тут раней была сінагога, але знешні выгляд будынка ніякім чынам не дае падставы думаць, што гэта так.

З улікам значнай часткі жыхароў каталіцкага веравызнання, у пачатку XX ст. у вёсцы быў пабудаваны новы касцёл, але на мяжы вёскі, што тлумачыць, наколькі каталіцкая вера тады тут не віталася. Вось таму і пабудова была здзейснена не ў цэнтры мястэчка. У пачатку XXI ст. у вёсцы з'явілася пратэстанцкая царква (царква баптыстаў, як гавораць жыхары). Гэта невялікі цагляны дамок з добра дагледжаным садам і гародам. І пратэстантаў у вёсцы шмат, яны актыўна наведваюць сваю царкву. Але сінагогі, з улікам таго, што калісьці гэта было яўрэйскае мястэчка і мела іх 3, цяпер няма.

Пасля аб'яднання Заходняй Беларусі з БССР Моўчадзь пачала страчваць сваю значнасць. Многія мястэчкі ператварыліся ў раённыя цэнтры, аграгарадкі, але не Моўчадзь. У 1970 – 1990 гг. я прыязджала ў вёску кожнае лета і памятаю, якім бурлівым жыццём у той час яна жыла. Тут працаваў Дом побыту; прадуктовая і прамтаварная крамы; кнігарня, дзе можна было знайсці кнігі, якія не так проста адшукаць у горадзе; аптэка; гаспадарчая крама; чайная; школа і дзіцячы садок, бальніца і школа-інтэрнат для дзяцей, хворых на сухоты. Асабліва падабалася ездзіць па смачныя вафельныя трубачкі, якія мы куплялі на тэрыторыі вясковай пякарні. А якой знаходкай для мяне была мясцовая бібліятэка, што размяшчалася ў асобнай драўлянай хатцы, мела толькі адзін пакой і сховішча кніг. Я вучылася ў педагагічным універсітэце, праграмныя кнігі па літаратуры не так проста было знайсці, і менавіта тут я вышуквала кнігі па замежнай літаратуры. Дзядуля і бабуля працавалі настаўнікамі ў школе-інтэрнаце, гэта спрыяла таму, што я магла браць кнігі на некалькі месяцаў і забіраць іх у Мінск. Дзесяць гадоў таму на месцы старой бібліятэкі я ўбачыла разабраныя бярвенні, якія не паспелі яшчэ прыбраць тут, а бібліятэка перамясцілася ў памяшканне клуба. Вельмі сумна было ўбачыць знішчаны будынак любімай бібліятэкі, а жадання наведваць яе новае месца ўжо не было.

Сёлетнія святочныя падзеі ў вёсцы павінны разгарнуцца ў цэнтры – на былой рынкавай плошчы. Тут знаходзіцца вялікі помнік землякам, каля якога на плітах можна прачытаць імёны загінулых ці зніклых без весткі жыхароў пад час Вялікай Айчыннай вайны; цяпер яго рэстаўруюць і прыводзяць у парадак.

Месца, дзе знаходзіўся старажытны касцёл, расчышчаюць: тут плануецца арганізаваць этнаграфічны музей пад адкрытым небам, пра арганізацыю якога адміністрацыя вёскі паведаміла жыхарам з просьбай далучыцца да яго стварэння.

Як не стала калгаса, мясцовым жыхарам цяжка зарабіць у вёсцы, яны часцей накіроўваюцца ў Баранавічы ці ў іншыя месцы на працу. Але з'яўляюцца вуліцы, новыя будынкі, куды на лета наязджаюць дачнікі – гарадскія жыхары. Таму вёска жыве, толькі выбрала сабе іншае, спакойнае ад клопатаў і шуму жыццё невялікай мясціны са старажытнымі пабудовамі і курганам, які ахоўваецца дзяржавай як гісторыка-культурная каштоўнасць.

Чаму ж вялікае мястэчка змяніла рытм жыцця і запаволіла бег часу? Магчыма, гэта звязана з тым, што цяжкі лёс напаткаў Моўчадзь у гады Вялікай Айчыннай вайны, на яе тэрыторыі ўжо з ліпеня 1941 г. было створана гета. Ва ўрочышчы Папоўскія Горы былі расстраляны ў 1942 г. 3300 яўрэяў з Моўчадзі і іншых паселішчаў, пазней там жа расстралялі яшчэ больш за 200 яўрэяў – рабочых тарфянога прадпрыемства. Ужо ў 2000-х гг. нашчадкі расстраляных, якія прыехалі з-за мяжы і знайшлі месца масавага забойства, усталявалі ва ўрочышчы, што схавана густым лесам, помнік «Ахвярам нацызму». Цяпер да помніка вядзе сцяжынка, добра пратаптаная тут заўсёды, што гаворыць: пра забітых памятаюць. Таму і помнік, за якім прыглядаюць, не застаецца забытым...

*Таццяна ЛАЎРЫК*
*Фота аўтара*



*Рынкавая плошча. Сучасны выгляд. Май 2022 г.*



*Месца, дзе стаяў стары касцёл. Май 2022 г.*